ТБа
317746

# Беларуская мова 8 клас

## Дыктанты, пераказы, пераклады



Дапаможнік для настаўнікаў агульнаадукацыйных школ, гімназій, ліцэяў

*Пад рэдакцыяй П.А. Міхайлава*

Рэкамендавана ўстановай «Навукова-метадычны цэнтр вучэбнай кнігі і сродкаў навучання» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*2-е выданне*

Мінск
«Аверсэв»
2003

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 808.26(075.3)
ББК 81.2Беи-922
Б43
***Аўтары:***
І. Л. Бурак, П. А. Міхайлаў, Т. А. Мытнік, Н. У. Чайка

Рэцэнзенты:
канд. філал. навук, дац. каф. рыторыкі і методыкі выкладання моў і літаратур Бел. дзярж. ун-та ***І. М. Саматыя***; настаўнік бел. мовы і літ-ры СШ № 2 г. Маладзечна ***Г. Ф. Гусева***

**Беларуская** мова: Дыктанты, пераказы, пераклады:
Б43 8 клас: Дапам. для настаўнікаў агульнаадукац. шк., гімназій, ліцэяў/І. Л. Бурак, П. А. Міхайлаў, Т. А. Мытнік, Н. У. Чайка; Пад рэд. П. А. Міхайлава. — 2-е выд. — Мн.: «Аверсэв», 2003. — 224 с.
ISBN 985-478-208-5.

Дапаможнік прызначаны настаўнікам і навучэнцам школ, гімназій і ліцэяў для замацавання і ўдасканальвання сваіх ведаў па беларускай мове.

Раздзелы дапаможніка адпавядаюць асноўным навучальным тэмам праграмы агульнаадукацыйнай школы і падручнікаў для навучэнцаў 8 класа.

УДК 808.26(075.3)
ББК 81.2Беи-922

*Вучэбнае выданне*

**Бурак** Ірына Леанідаўна
**Міхайлаў** Павел Аляксандравіч
**Мытнік** Таццяна Аляксандраўна
**Чайка** Наталля Уладзіміраўна

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА**
**Дыктанты, пераказы, пераклады**
**8 клас**
Дапаможнік для настаўнікаў агульнаадукацыйных школ, гімназій, ліцэяў
*2-е выданне*

Адказны за выпуск *Дз. Л. Дзямбоўскі*

Падпісана ў друк з гатовых дыяпазітываў 24.07.2003. Фармат 84×108 1/32.
Папера друкарская № 2. Гарнітура «Школьная». Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 11,76. Ул.-выд. арк. 7,54. Тыраж 5100 экз. Зак. 166[illegible].
Пасведчанне № 08-33-0.156048
аб дзяржаўнай гігіенічнай рэгістрацыі прадукту ад 13.12.20[illegible].
Таварыства з дадатковай адказнасцю «Аверсэў».
Ліцэнзія ЛВ № 106 ад 25.07.2002. Кантактны тэлефон (017) 210-18-[illegible].
E-mail: info@aversev.com; www.aversev.com
Рэспубліка Беларусь, 220123, Мінск, М. Багдановіча, 129а.
Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
220013, Мінск, праспект Ф. Скарыны, 79.

ISBN 985-478-208-5
© Калектыў аўтараў, 2002
© Афармленне. ТДА «Аверсэў», 2002

# ПРАДМОВА

*Гэты дапаможнік прызначаны настаўнікам і навучэнцам школ, гімназій і ліцэяў для замацавання і ўдасканальвання сваіх ведаў па беларускай мове. Ён складзены ў поўнай адпаведнасці з дзеючай вучэбнай праграмай і падручнікамі па беларускай мове для 8 класа школ з рускай і беларускай мовамі навучання, а таксама з улікам «Адзінага моўнага і арфаграфічнага рэжыму школы»*.*

*Кніга складаецца з дзевяці самастойных раздзелаў: «Словазлучэнне», «Сказ», «Просты сказ: двухсастаўныя сказы», «Просты сказ: аднасастаўныя сказы», «Просты сказ: няпоўныя сказы», «Просты сказ: сказы з аднароднымі членамі», «Просты сказ: сказы са звароткамі, пабочнымі словамі і выклічнікамі», «Просты сказ: сказы з адасобленымі членамі», «Спосабы перадачы чужой мовы». Гэтыя раздзелы адпавядаюць асобным навучальным тэмам і размяшчаюцца строга ў паслядоўнасці, вызначанай вучэбнай праграмай і падручнікамі для навучэнцаў 8 класа.*

*Кожны асобны раздзел змяшчае тры віды пісьмовых прац — дыктанты, пераказы і пераклады, мэтанакіравана*

---

* Праграмы сярэдняй агульнаадукацыйнай школы з беларускай мовай навучання: Беларуская мова. V—XI класы. — Мн., 2000.

Праграмы сярэдняй агульнаадукацыйнай школы з рускай мовай навучання: Беларуская мова. V—XI класы. — Мн., 2000.

Антанюк Л. А., Бадзевіч З. І., Кныш М. К., Саматыя І. М. Беларуская мова: Сінтаксіс і пунктуацыя: Падручнік для 8 класа школ з беларускай мовай навучання. Выданне другое. — Мн., 2001.

Тамашэвіч Т. І. Беларуская мова: Падручнік для 8 класа школ з рускай мовай навучання. — Мн., 1999.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

в з м е т н ý л и с ь  б р ы́ з г и — узняліся пы́рскі
к р ó х о т н а я  п о л ы н ь я́ — малéнькая пратáліна
к р ó м к а — беражóк
и з н é ж е н н ы й — спéшчаны

### ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Адказаць на пытанні:
   Дзе і калі адбываецца дзеянне?
   Каго ўбачыў паляўнічы? Чаму ён здзівіўся?
   Як паводзілі сябе лебедзі на возеры? Што рабіў лебедзь-важак?
   Як паляўнічы стаў адносіцца да лебедзяў пасля ўбачанага на возеры?
2. Вызначыць стыль тэксту.
   Знайсці ў тэксце пачатак, асноўную думку, заключэнне.
   Суаднесці прыкладны план з пытаннямі да тэксту.
   Адказы на пытанні запісаць, выкарыстоўваючы апорныя словазлучэнні.
3. Падкрэсліць пытальныя і клічныя сказы.

### ПРЫКЛАДНЫ ПЛАН

1. Сібірскія вёсны.
2. Лебедзі на возеры.
3. Птушкі-працаўнікі.

### АПОРНЫЯ СЛОВАЗЛУЧЭННІ

Чарада лебедзяў, ажыўлена пераклікацца, здабыць корм, упартая настойлівасць, скрышыць лядовую браню, узняліся пырскі, маленькая праталіна.

# ПРОСТЫ СКАЗ: ДВУХСАСТАЎНЫЯ СКАЗЫ

## ДЫКТАНТЫ

### ПАПЕРАДЖАЛЬНЫ ДЫКТАНТ

#### Надыход вясны

Зайшло сонца, і праз сасоннік на рог канюшыны, праз вёску, была відаць паласа чырвонага неба. Ля самай зямлі яна пералівалася і дрыжала яркім агнём. Андрэю здавалася, што сонца зайшло зусім блізка за лесам. У прагале над дарогай, што вяла з участка ў вёску, таўклі свежы мак камары цяжкай **плоймай**, як іх нагнала сюды з усяго лесу. Яны добра былі відаць здалёку на **ядранай** чырвані.

Камары дрыжалі і ля канюшыны, ля дзвярэй, над самай лужынай, што нацякла з-пад лёду і стаяла, запеніўшыся, як мора. Ля дзвярэй была падсунута граблямі чорная з зімы **патруха**, чыста падмецена **гальнікам** да самай зямлі. Зямля адтавала ўвачавідкі, рабілася мокрая. Патруха і **шума** былі ссунуты са сцежкі ля падстрэшніка, што вяла на дарогу цераз леташняе бульбянішча. На сцежцы быў відаць чысты, белы, як цукар, лёд. Ён раставаў па краях і пеніўся, што мыла. (136 слоў)

*Паводле І. Пташнікава*

### ЗАДАННІ

1. Знайсці ў тэксце двухсастаўныя развітыя сказы
2. Падкрэсліць у іх граматычную аснову.
3. Растлумачыць значэнне выдзеленых слоў з дапамогай тлумачальнага слоўніка.



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

## КАМЕНЦІРАВАНЫ ДЫКТАНТ

### Раніца

Толькі патухне на небе апошняя зорка, толькі паспее разысціся цемната кароткае ночы і чырвоным пажарам **загарыцца** край неба на ўсходзе, вёска прачынаецца. Шум і трывога дня пачынае памалу ўваходзіць у сваю каляіну. Па вуліцы ўжо ідзе пастух з доўгаю пугаю на кароткім пугаўі, з торбаю, перакінутаю цераз плячо.

**Скрыпяць** у хлявах вароты, мыкаюць каровы, бляюць авечкі. Пастух ляскае пугаю, наганяе страх на сваіх належных: кароў, авец і свіней. Бабы з заспанымі тварамі **спяшаюцца** выганяць на вуліцу сваю жывёлу. Уся вуліца аж гаворыць ад рыкання валоў і бляяння авец. Доўгая чарада жывёлы цягнецца па ўсёй вуліцы, падымае цэлую хмару пылу.

**Заскрыпелі** калодзезі, і бабы з карамысламі і вёдрамі ідуць па ваду. Чуцен іх борзды і моцны говар і смех. Тонкімі, роўнымі слупкамі падымаецца белаваты дымок з комінаў і **разліваецца** ў небе клубочкамі, і пераліваецца ў першых промнях сонца. (138 слоў)

*Паводле Якуба Коласа*

**ЗАДАННІ**

1. Знайсці ў тэксце і падкрэсліць акалічнасці.
2. Вызначыць, якімі часцінамі мовы выражаны акалічнасці.
3. Зрабіць марфемны разбор выдзеленых слоў.

## ТЛУМАЧАЛЬНЫ ДЫКТАНТ

### Вячэрняя рапсодыя

А сонца зусім нізка, здаецца, адным сваім краем упіраецца ў зямлю. Патух яго яркі дзённы бляск, і само яно зрабілася чырвонае, круглае, вялікае. Вось ніжняя частка яго ўрэзваецца ў вузкую тонкую палоску хмаркі і выплывае, перарэзаўшы яе. Палоска, як абручык, як



паясок, прыходзіцца ўжо пасярэдзіне. Вось яно ўлазіць глыбей і глыбей у зямлю. Адну толькі палавіну яго відаць, ды і тая ўсё звужаецца, і вось адзін толькі яго беражок блішчыць над зямлёю. Яшчэ хвіліна — і ён схаваецца, патухне, як апошняя іскарка на вугольчыку, сыдзе, як апошні вясёлы смех з чыстага твару добрага чалавека. Толькі роўны, светлы слупок уздымаецца над ім, ды і той скора меркне, расплываецца, зліваецца са светла-чырвонаю палоскаю неба. І ўвесь божы свет накрываецца чорнаю коўдрай ночы. З-за лесу ледзь-ледзь выразаюцца чорныя хмары няроўнымі грудамі рознай формы, з яркімі, як абцягнутымі залатою тасёмкаю, краямі. (136 слоў)

*Паводле Якуба Коласа*

**ЗАДАННІ**

1. Знайсці ў тэксце прамыя і ўскосныя дапаўненні.
2. Вызначыць, якой часцінай мовы яны выражаны.

## ТВОРЧЫЯ ДЫКТАНТЫ

◇ ◇ ◇

Аднойчы прыгожым летнім ранкам Артур кінуў працу і вырашыў — хай будзе, што будзе, — правесці гэты цудоўны дзень у зялёным лесе, каб палюбавацца на дзікіх аленяў, насыціцца вольным жыццём пад адкрытым небам, па якім ён ужо даўно сумаваў. Ён узяў лук, стрэлы і вялікую дубіну, без якой ні на крок не адлучаўся з дому, і падаўся ў Шэрвудскі лес.

Дзень выдаўся спякотны. Артур амаль тры гадзіны гуляў па лесе, усё глыбей і глыбей забіраючыся ў яго. Ён ужо крыху прытаміўся, таму прылёг адпачыць на імшысты грудок пад купкай ляшчынніку. Нечакана перад яго вачамі паўстаў цудоўны малюнак: на паляне да яго набліжаўся статак зграбных плямістых аленяў. (104 словы)

*Паводле Дж. Ф. Купера*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**ЗАДАННІ**

1. Даць загаловак тэксту.
2. Прыдумаць заканчэнне гісторыі, выкарыстоўваючы развітыя двухсастаўныя сказы.
3. Падкрэсліць у тэксце азначэнні і вызначыць, якой часцінай мовы яны выражаны.

## Каляды

Самая важная работа ішла ў хаце. Сягоння Кася раней запаліла ў печы. Белаваты дымок роўна падымаўся ўгару і расплываўся высока ў ціхім марозным паветры. Каля печы стаяў ужо заслон, накрыты чыстым настольнікам. На адным яго канцы стаяла ражка з цестам. Скавароды весела брынчалі на прыпеку, і мяккія гарачыя аладкі кідаліся, як ігрушкі, спрытнаю рукою Касі. Уся лава проці печы была застаўлена міскамі, гарнушкамі, гаршкамі з усякімі прыпасамі для вячэры.

Пачынала змяркацца.

У покуце на сене ўжо важна стаяў гаршчок з куццёю. Мужчыны ўхадзіліся і цяпер мыліся ў ночвах. Дзядзька засеў брыцца. Малыя даўно памыліся, прыбраліся і гатовы былі сесці за стол. (101 слова)

*Паводле Якуба Коласа*

**ЗАДАННЕ**

Дапоўніць тэкст сказамі (3—4) пра тое, як раней адзначалі Каляды, выкарыстоўваючы двухсастаўныя развітыя сказы з рознымі відамі акалічнасцей (месца, спосабу дзеяння, прычыны, уступкі і іншыя).

# ВОЛЬНЫЯ ДЫКТАНТЫ

## Маленькі салдат

Колькі ледзьве прыкметных партызанскіх сцяжынак, пракладзеных зусім дзіцячымі нагамі, хавалі ад варожых вачэй родныя беларускія гаі і дубровы, пушчы і пералескі! Як многа разоў у спёку хаваліся ў іх цяні юныя разведчыкі і сувязныя! Якімі прывабнымі, жаданымі і любымі былі гаі ды пушчы для юнакоў-партызанаў і ўзімку, калі даводзілася прабірацца з акупіраванага горада!

Сярод тых, хто горача любіў родныя дубровы, пушчы ды пералескі, быў і юны партызанскі сувязны Саша. Мне невядома, жывы ён цяпер ці не. Можа, дзе-небудзь працуе на родный зямлі, якую засланяў тады сваімі грудзьмі падлетка.

Быў ён невысокі ростам, заўсёды падцягнуты, спрытны. Перашыты з чужога пляча шынель яго быў падпяразаны шырокім вайсковым рэменем, а пад насунутай крыху на вуха будзёнаўкі свяціўся круглы тварык з дапытлівымі, цікаўнымі вачыма. Вось такі ён і застаўся ў памяці падпольшчыкаў — маленькі баявы салдацік вялікай партызанскай арміі. (133 словы)

*Паводле І. Новікава*

**ЗАДАННЕ**

Запісаць тэкст у вольнай форме, выкарыстоўваючы ў якасці ключавых простыя неразвітыя сказы.

## Вырай

Адляцяць птушкі далёка, у паўднёвыя краіны, у тыя краіны, якія ляжаць на поўдзень, дзе зімы зусім не бывае. Але не ўсе птушкі, што пакідаюць нас на зіму, злятаюцца ў адно месца. Некаторыя з іх, так званыя зерняядныя, застаюцца ў паўднёвых расейскіх губернях, дзе яны могуць знайсці сабе корм, і жывуць там да тых пор, пакуль у нас зіма. Другія, насякомаядныя, якія кормяцца ўсякімі мошкамі, мухамі, камарамі, ляцяць надта далёка, дзе зімы ніколі не бывае.

Многа бяды і гора прыходзіцца выцерпець нашым мілым птушкам у далёкай дарозе, пакуль заляцяць яны на зімовыя кватэры. Некаторым прыходзіцца пералятаць моры, і многа іх прападае ў дарозе ад буры і ўсякіх небяспечнасцей як ад чалавека, так і ад драпежных птушак.

У выраі нашы птушкі гнёздаў не ўюць і песень не спяваюць. Віць свае гнёзды і выводзіць дзетак





РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

яны прылятаюць на сваю радзіму. А радзіма-бацькаўшчына іх тут, у нас. (143 словы)

*Паводле Якуба Коласа*

**ЗАДАННІ**

1. Запісаць тэкст у вольнай форме, выкарыстоўваючы ў якасці ключавых простыя неразвітыя сказы.
2. Вызначыць, якімі часцінамі мовы выражаны дзейнікі ў простых неразвітых сказах.

## Адзінокае дрэва

Дзіўна, як уцалела гэтая адзінокая сасна і чаму за доўгія гады не вырасла паблізу хоць маленькай сасонкі? Дол на грудку штогод засеян шышкамі. Шышак — безліч, а спадчыны сасна не пакінула.

Мабыць, вінавата проста месца. Непатрэсканыя шышкі, сарваныя ветрам, падаючы на дарогу, заціраюцца коламі ў пясок. Не відаць знаку і ад тых, што сыплюцца на грудок, трэснуўшы на сасне, выкінуўшы насенне. На сухім грудку цяжка ўзнікнуць жыццю, бо вельмі часта любяць тут прыпыняцца падарожныя.

Адным словам, чаму сасна адзінокая, разабрацца можна. А вось чаму яе, нічыю, прыдарожную, за доўгія гады ніхто не ссек, — адказаць цяжка. Тым болей, што людзям заўсёды патрэбна было дрэва — на хаты, на дошкі, а смалістая лучына — на распал. (111 слоў)

*Паводле І. Навуменкі*

**ЗАДАННІ**

1. Запісаць тэкст у вольнай форме, замяняючы складаныя сказы на простыя двухсастаўныя развітыя.
2. Выпісаць з тэксту акалічнасці месца і вызначыць, якімі часцінамі мовы яны выражаны.

## Надыход ночы

Ціха на зямлю спускаецца ноч. Усё заціхае. Птушкі перасталі спяваць і дрэмлюць на сваіх гнёздах. Край неба, дзе зайшло сонца, блішчыць шырокаю чырвонаю стужкаю.



Тонкія, лёгкія хмаркі афарбаваліся ў залаты колер, усё роўна як абняло іх полымя. Бледнаватаю плёнкаю ўздымаецца туман над лугамі і балотамі. А цемната ўсё гусцее і гусцее, і закрывае ад вачэй і поле, і лес. Вот узышла ўжо першая вячэрняя зорка; ледзь-ледзь свецяцца ў далёкім небе скрозь цемнату і другія маленькія зорачкі. Вот яны свецяць ярчэй, дрыжаць, пераліваюцца дзіўным бляскам. Кажаны вылецелі са сваіх месцаў, дзе сядзелі яны ўвесь дзень, круцяцца, падаюць на ніз, ізноў падымаюцца ўгору і цыркаюць тоненькім піскам. За сялом, на балоце, закрахталі жабы. (111 слоў)

*Паводле Якуба Коласа*

**ЗАДАННІ**

1. Запісаць тэкст у вольнай форме, выкарыстоўваючы простыя развітыя сказы з рознымі відамі азначэнняў.
2. Падкрэсліць дапасаваныя азначэнні. Вызначыць, чым яны выражаны.

## Асенняя песня

Апусцела поле. Работы на ім даўно скончаны. Пуста і глуха ўсюды, толькі маладое жыта зелянее ў полі і рэзка вылучаецца сярод мёртвага вобраза асенняга часу. Пачарнеў шырокі луг, адны толькі парыжэлыя фігуры стагоў з востраю жэрдкаю ўверсе раскінуліся па лугах і нудна пазіраюць у неба. А само неба, закрытае сівымі хмарамі, так хмурна і непрытульна глядзіць на зямлю і шчыра сее дождж, як слёзы нягоды. Чорны лес шуміць бесперапынна, калыхае сваімі голымі верхавінамі, размахвае лапамі і сцёбае галінаю галіну. Неспакойны сярдзіты вецер вее як дзень, так ноч, падымае мокрае жоўтае лісце, разносіць яго па полі, усцілае ім дарогу і гоніць хмары за хмарамі, і залівaецца нуднымі песнямі ў коміне мужычае хаты, як бы просіць ён там сабе прыпынку або хоча выдуць з хаты жменьку цёплага духу. Глуха шуміць голая вярба над страхою і вокнамі. (134 словы)

*Паводле Якуба Коласа*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ЗАДАННІ

1. Запісаць тэкст у вольнай форме, выкарыстоўваючы ў якасці ключавых сказаў простыя развітыя.
2. Падзяліць тэкст на абзацы.
3. Падкрэсліць прамыя дапаўненні ў запісаным тэксце і вызначыць, чым яны выражаны.

## ВЫБАРАЧНЫЯ ДЫКТАНТЫ

### Шлях да навукі

Для людзей наша Зямля яшчэ пляскатая і плавае на трох кітах. Толькі праз пятнаццаць гадоў выправіцца Магелан у сваё кругасветнае падарожжа, якое ўпершыню дакажа чалавецтву, што Зямля — шар, і будзе атрымана ўяўленне пра яе памеры...

І вось Францішак Скарына выпраўляецца ў вялікую дарогу вучыцца.

Запісваюць ва ўніверсітэт на працягу ўсяго года. Таму спяшацца абавязкова да нейкай даты не трэба. Можна нават на нейкі час уладкавацца вучыць дзяцей дзе ў якой школцы, каб прызарабіць грошай, а тады рушыць далей.

Вядома, куды весялей і надзейней пусціцца ў дарогу не аднаму, а ўдвух, утрох і большым гуртам. Але тут зноў свае выгоды і невыгоды. Бо часам, яшчэ згледзеўшы здалёк купку школяроў, гарадская варта зачыняе вароты, каб не ўпусціць іх у горад.

Некаторыя школяры выпраўляліся ў навуку, далучыўшыся да купецкага абозу. Відаць, якраз так і дабіраўся ў Кракаў наш Францішак, сын полацкага купца. (139 слоў)

*Паводле А. Клышкі*

ЗАДАННІ

1. Выпісаць з тэксту прамыя і ўскосныя дапаўненні з дзеясловам.
2. Вызначыць від сінтаксічнай сувязі паміж імі.



### Бярозка

Развітаўшыся з цёткай Арынай, хлопцы зноў выйшлі на агарод і цераз лужок накіраваліся да Выгараў. Дарога была недалёкая.

Выгары — гэта звычайны ўзгорак. Адразу за ім пачынаецца Нягневіцкі лес. Калісьці на ўзгорку шумелі высокія дрэвы. Здарыўся пажар, і ўсе яны выгаралі. Адсюль і пайшла назва ўзгорка.

Цудам уцалела на самым яго версе адна-адзіная белая бяроза. Гордая прыгажуня, яна была відаць здалёк, бо ўзвышалася над усім суседнім лесам. А там, дзе некалі раслі і загінулі яе стройныя сёстры, узняўся такі непралазны хмызняк, праз які ні прайсці было, ні праехаць. Толькі хлопцы яшчэ ў пачатку вайны зрабілі з боку Нягневіцкага лесу непрыкметны праход праз гэты хмызняк. Пятляючы сярод кустоў, праход гэты вёў да белай бярозы. Гэтае дрэва хавала ад чужога вока вялікую таямніцу трох неразлучных сяброў — Якімкі, Уладзіка і Васі — іхні склад зброі. (130 слоў)

*Паводле Я. Курто*

ЗАДАННІ

1. Выпісаць з тэксту словазлучэнні з акалічнасцямі.
2. Вызначыць, якой часцінай мовы выражаны акалічнасці.

## ДЫКТАНТ «ПІСЬМО ПА ПАМЯЦІ»

### Майскі вечар

Павольна апускаецца на зямлю майскі вечар. Змрок мяккі, шэравата-празрысты, колеры ў ім як бы злёгку прыглушаны, змешаны ў адной непадзельнай гаме. Чарнее голая яшчэ зямля, шарэюць кусты, з ваколіцы, з нізіны, цягне прыемнай вільготнасцю. Там, у нізіне, прабуе голас кулік. Тысячамі шорахаў напоўнен майскі вечар. Можа, прабудзіліся ад зімовай спячкі мышы і шасцяць у леташняй пожні. Можа, гуляе на першай кволай траве заяц...



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Змест


*Прадмова* ..... 3

**СЛОВАЗЛУЧЭННЕ**

ДЫКТАНТЫ ..... 7

Папераджальны дыктант ..... 7
Каменціраваны дыктант ..... 8
Творчы дыктант ..... 9
Вольны дыктант ..... 9
Дыктант «Пісьмо па памяці» ..... 10
Дыктант «Правяраю сябе» ..... 11
Выбарачныя дыктанты ..... 12
Кантрольны дыктант ..... 12

ПЕРАКАЗЫ ..... 13

ПЕРАКЛАДЫ ..... 20

Пераклад-пераказ ..... 29

**СКАЗ**

ДЫКТАНТЫ ..... 33

Папераджальныя дыктанты ..... 33
Каменціраваныя дыктанты ..... 34
Тлумачальны дыктант ..... 36
Вольны дыктант ..... 37
Дыктанты «Пісьмо па памяці» ..... 37
Дыктант «Правяраю сябе» ..... 39
Выбарачны дыктант ..... 40
Кантрольныя дыктанты ..... 40

ПЕРАКАЗЫ ..... 42

ПЕРАКЛАДЫ ..... 49

Пераклад-пераказ ..... 50

**ПРОСТЫ СКАЗ: двухсастаўныя сказы**

ДЫКТАНТЫ ..... 53

Папераджальны дыктант ..... 53
Каменціраваны дыктант ..... 54
Тлумачальны дыктант ..... 54
Творчыя дыктанты ..... 55
Вольныя дыктанты ..... 56
Выбарачныя дыктанты ..... 60
Дыктант «Пісьмо па памяці» ..... 61
Дыктант «Правяраю сябе» ..... 62
Кантрольныя дыктанты ..... 63

ПЕРАКАЗЫ ..... 66

ПЕРАКЛАДЫ ..... 74

**ПРОСТЫ СКАЗ: аднасастаўныя сказы**

ДЫКТАНТЫ ..... 91

Папераджальны дыктант ..... 91
Каменціраваныя дыктанты ..... 92
Тлумачальны дыктант ..... 93
Творчы дыктант ..... 94
Вольны дыктант ..... 94
Выбарачны дыктант ..... 95
Дыктант «Пісьмо па памяці» ..... 96
Дыктант «Правяраю сябе» ..... 97
Кантрольныя дыктанты ..... 97

ПЕРАКАЗЫ ..... 99

ПЕРАКЛАДЫ ..... 107

**ПРОСТЫ СКАЗ: няпоўныя сказы**

ДЫКТАНТЫ ..... 109

Папераджальны дыктант ..... 109
Каменціраваны дыктант ..... 110
Дыктант «Пісьмо па памяці» ..... 110
Дыктант «Правяраю сябе» ..... 111
Кантрольныя дыктанты ..... 112

ПЕРАКАЗЫ ..... 113

ПЕРАКЛАДЫ ..... 119

**ПРОСТЫ СКАЗ: сказы з аднароднымі членамі**

ДЫКТАНТЫ ..... 121

Папераджальныя дыктанты ..... 121
Каменціраваныя дыктанты ..... 123
Тлумачальны дыктант ..... 124
Творчыя дыктанты ..... 125
Вольны дыктант ..... 126
Выбарачныя дыктанты ..... 127
Дыктант «Пісьмо па памяці» ..... 129
Дыктант «Правяраю сябе» ..... 129
Кантрольныя дыктанты ..... 130

ПЕРАКАЗЫ ..... 132

ПЕРАКЛАДЫ ..... 140


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ПРОСТЫ СКАЗ: сказы са звароткамі, пабочнымі словамі і выклічнікамі

ДЫКТАНТЫ ........................................ 146
Тлумачальны дыктант ........................................ 146
Вольныя дыктанты ........................................ 147
Выбарачны дыктант ........................................ 149
Дыктант «Пісьмо па памяці» ........................................ 149
Дыктант «Правяраю сябе» ........................................ 150
Кантрольны дыктант ........................................ 151
ПЕРАКАЗЫ ........................................ 152
ПЕРАКЛАДЫ ........................................ 157

## ПРОСТЫ СКАЗ: сказы з адасобленымі членамі

ДЫКТАНТЫ ........................................ 162
Папераджальны дыктант ........................................ 162
Каменціраваны дыктант ........................................ 163
Тлумачальны дыктант ........................................ 164
Вольныя дыктанты ........................................ 164
Выбарачныя дыктанты ........................................ 166
Дыктант «Пісьмо па памяці» ........................................ 167
Дыктант «Правяраю сябе» ........................................ 168
Кантрольныя дыктанты ........................................ 169
ПЕРАКАЗЫ ........................................ 171
ПЕРАКЛАДЫ ........................................ 179

## СПОСАБЫ ПЕРАДАЧЫ ЧУЖОЙ МОВЫ

ДЫКТАНТЫ ........................................ 192
Папераджальныя дыктанты ........................................ 192
Каменціраваны дыктант ........................................ 193
Творчы дыктант ........................................ 194
Вольны дыктант ........................................ 195
Выбарачны дыктант ........................................ 195
Кантрольны дыктант ........................................ 196
ПЕРАКАЗЫ ........................................ 197
ПЕРАКЛАДЫ ........................................ 204
Пераклады-пераказы ........................................ 206

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ